русь. Аўтар навук. прац «Кароткая гісторыя Беларусі» (2-е выд. 1993), «Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі» (2-е выд. 2012), артыкулаў пра С.Палуяна, П.Багрыма, Ц.Бычкоўскага, К.Каліноўскага, В.Цяпінскага і інш., успамінаў пра М.Багдановіча, Я.Купалу, «нашаніўскі перыяд». Выдаў «Падручны расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік» (Коўна, 1924). У 1925 апублікаваў «Летапісец Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага» паводле спіса Рачынскага. Аўтар гіст. аповесці «Лабірынты» (1923), сцэнічнага эпізода з жыцця Ф.Скарыны («Адзінокі», 1923). Друкаваўся пад псеўд. Власт, Юры Верашчака, Арцём Музыка, Сваяк, Пагашчанін, Ю.Сулімскі і інш. Апрацоўваў гіст. легенды, перакладаў з рус., англ., польск., дацкай і інш. моў.

*Тв.*: Выбр. творы. Мінск, 1997.

*Літ.*: Янушкевіч Я.Я. Неадменны сакратар Адраджэння: Вацлаў Ластоўскі. Мінск, 1995; Марціновіч А.А. Хто мы, адкуль мы ...: гіст. эсэ, нарысы. У 3 кн. Кн. 3. Мінск, 2008; Мяснікоў А.Ф. Сто асоб беларускай гісторыі: гіст. партрэты. Мінск, 2009. *Я.Я.Янушкевіч.*

**ЛАТА**, сцяна, аднасценная сетка, прызначаная для лоўлі рыбы на хуткім цячэнні; традыц. рыбалоўная прынада. Па баках сеткі меліся дзве палкі, да якіх прывязвалі вяроўкі. Л. аснашчалі паплаўкамі і грузілам так, каб не танула. У час руху ў вадзе Л. прымала форму жолаба, каля задняй сцяны якога збіралася рыба. Выкарыстоўвалі Л. на рэках Брэстчыны і Гродзеншчыны.

**ЛАТУШКА**, латка, 1) ганчарны выраб у беларусаў і інш. слав. народаў; гліняная пасудзіна для гатавання ежы, часам ужывалася для вадкіх страў замест сталовай міскі. Рабілі з шырокімі круглымі ў плане тулавам і вусцем, расхіленымі прамымі ці пукатымі сценкамі, гартавалі, часам глазуравалі. У Паўн.-Зах. Беларусі бытавалі таксама Л. з выцягнутым (авальным) дном («доўгія» Л.). З ужытку выйшлі ў 1-й пал. 20 ст. 2) Прадмет адзення — кароткая *світка* ў паўн.-зах. Палессі. *Я.М.Сахута.*

**ЛАТЫГАЛЬСКАЯ МІКАЛАЕЎСКАЯ ЦАРКВА**, помнік драўлянага дойлідства з рысамі барока ў в. Латыгаль Вілейскага р-на. Пабудавана ў 1771 як уніяцкая. Прамавугольны ў плане асн. аб'ём і квадратная апсіда аб'яднаны агульным дахам, які на гал. фасадзе завершаны цыбулепадобным купалам на 4-гранным барабане. Невял. макаўка вянчае дах над апсідай. Франтон над гал. фасадам падзелены на 2 ярусы, прарэзаны па цэнтры лучковым вітражным аконным праёмам. Да апсіды па баках далучаны нізкая рызніца і ахвярнік. Вертыкальна ашаляваныя сцены прарэзаны прамавугольнымі аконнымі праёмамі. Храм унесены ў Дзярж. спіс гісторыка-культ. каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Царква дзейнічае.

*Латыгальская Мікалаеўская царква.*



**ЛАТЫШСКАЯ МОВА**, адна з балтыйскіх моў індаеўрап. моўнай сям'і. Генетычна блізкая да сучаснай літоўскай мовы. Пашырана ў Латвіі, выкарыстоўваецца на Пн Беларусі і Літвы, Пд Эстоніі, на З Пскоўскай вобл. Расіі, а таксама сярод латышоў ЗША, Расіі, Швецыі, Ірландыі, Эстоніі, Літвы, Канады, Вялікабрытаніі, Германіі і інш. Агульная колькасць носьбітаў Л.м. — каля 1,9 млн. чал. З'яўляецца дзярж. мовай Латвіі, адной з афіц. моў Еўрасаюза. Мае 3 дыялекты — сярэднелатышскі (аснова літ. мовы), лівонскі, верхнелатышскі. Кнігадрукаванне ўзнікла ў 1525, калі была апубл. «Нямецкая меса» на ніжненям., латышскай і эстонскай мовах. Пачатак развіцця літ. мовы прыпадае на 2-ю пал. 19 ст.

Фанетычны лад Л.м. утвараюць 12 галосных (доўгія і кароткія), 28 зычных гукаў і 10 дыфтонгаў. Націск амаль заўсёды фіксаваны на 1-м складзе. Сінтэтычна-флексійная мова. Назоўнікі маюць 2 роды (мужчынскі і жаночы), 6 тыпаў скланення, 7 склонаў (назоўны, родны, давальны, вінавальны, інструментальны, месны і клічны). Ніякі род і формы парнага ліку страчаны. Захаваліся пэўныя і няпэўныя формы прыметнікаў. Дзеяслоў мае 5 ладоў (абвесны, загадны, умоўны, пераказвальны, павіннасны), складаную сістэму часавых форм (простыя і складаныя формы цяперашняга, прошлага і бу-

дучага часу). У Л.м. сфарміраваліся арыгінальныя павіннасны і пераказвальны лады, дзеепрыслоўе змяняецца па родах і ліках. Сустракаюцца запазычанні са слав. моў, у т.л. з бел., германскіх і прыбалтыйска-фінскіх.

Апісанне структуры Л.м. пачалося ў 17 ст. Значны ўклад у яе вывучэнне ўнеслі А.Кронвалдс і Я.Эндзелін. Бел. гаворкі ў Латвіі даследаваў сучасны польск. лінгвіст М.Янковяк.

*Літ.*: Сталтмане В.Э. Латышский язык // Языки мира: Балтийские языки. М., 2006; Баршчэўскі Л.П., Гуцаў А.Ф. Кароткая граматыка латышскай мовы. Мінск, 2008; Рагаўцоў В.І. Мовы свету: энцыклапед. даведнік. Магілёў, 2009; Янковяк М. Беларускія гаворкі ў Краслаўскім раёне Латвіі: сацыялінгвістычнае даследаванне. Беласток; Вільнюс, 2012. *Д.В.Дзятко.*

**ЛАТЫШЫ** (саманазва латвіешы, latviesi), нацыя, асноўнае насельніцтва Латвіі. Паводле перапісу 2009 у Беларусі пражывала 1549 Л. Гавораць на латышскай мове балтыйскай групы індаеўрап. сям'і. Большасць вернікаў — лютэране і католікі, ёсць праваслаўныя. Склаліся да пач. 17 ст. ў народнасць, а да 19 ст. ў нацыю з балтыйскіх (куршы, земгалы, латгалы, селы) і фіна-ўгорскіх (лівы) этнічных аб'яднанняў.

У канцы 19 ст. значныя групы Л. пражывалі ў Віцебскім (каля 4 тыс. ж.), Аршанскім (3,7 тыс.) і Быхаўскім (1 тыс. ж.) паветах. Першыя латышскія каланісты з'яўляліся арандатарамі ў бел. памешчыкаў, пазней станавіліся ўласнікамі. У асноўным Л. займаліся земляробствам, жывёлагадоўляй і садаводствам, з промыслаў было развіта піваварэнне, з рамёстваў — ткацтва. У гады 1-й сусв. вайны колькасць Л. у Беларусі павялічылася і склала больш за 20 тыс. чал., у 1920—30-я гг. паменшылася да 14 тыс. У 1918 у Віцебску былі створаны латышскі кавалерыйскі полк і інш. ваен. фарміраванні. У 1920—30-я гг. ў БССР мелася 14 нац. латышскіх сельсаветаў, у іх складзе — нац. калгасы (13 у 1934). У месцах кампактнага пражывання Л. дзейнічалі латышскія школы. Існавала латышскае бюро пры ЦК КП(б)Б, рабочыя клубы ў Віцебску, Полацку і інш., секцыі, хаты-чытальні. Культ.-асветніцкай работай кіравала латышская секцыя Наркамата асветы БССР. На латышскай мове выходзілі кнігі, газеты. Мінская радыёстанцыя штотыдзень транслiравала передачы на латышскай мове. Вывучэннем гісторыі і культуры Л. у Беларусі займалася латышская камісія Інбелкульта (з 1928), сектар АН Беларусі (з 1929), секцыя Ін-та нац. меншасцяў АН Беларусі (з 1933); існаваў Ін-т літоўскай і латышскай культур (1933). У гады Вял. Айч. вайны на тэр. Беларусі дзейнічалі латышскія партыз. фарміраванні. Колькасць Л. у Беларусі складала ў 1959 — 2631 чал., у 1970 — 2660, у 1979 — 2617, у 1989 — 2658, у 1999 — 2239 чал. З 1995 дзейнічае Саюз Л. Віцебскай вобл. «Даўгава», праводзяцца штогадовыя Дні Латвіі (у Віцебску), літ. чытанні, выстаўкі, канцэрты. Пры консульстве Латвійскай Рэспублікі ў Віцебску працуе нядзельная школа.

*Літ.*: Тугай У.В., Галавач А.В. Дзе песні з Даўгавы гучалі. Мінск, 1992; Тугай У.В. Латышы на Беларусі. Мінск, 1999; Яго ж. Латышскі этнас у сацыяльна-эканамічным і культурным жыцці Беларусі. Мінск, 2002. *У.В.Тугай.*

**ЛАТЭ́НСКАЯ КУЛЬТУ́РА**, археалагічная культура кельцкіх плямён, распаўсюджаная ў 2-й пал. 1-га тыс. да н.э. ад Пірэнеяў на З да Карпацкай катлавіны на У, ад Вялікабрытаніі і Ірландыі на Пн да Міжземнага мора на Пд. Атрымала назву ад паселішча Ла Тэн на ўсх. беразе воз. Неўшатэльскае (Швейцарыя), якое было даследавана ў 1907—17. Л.к. развівалася на аснове гальштацкай культуры 1-й пал. 1-га тыс. да н.э. Для яе характэрны ўмацаваныя і неўмацаваныя паселішчы, якія размяшчаліся ў цяжкадаступных месцах. Гарадзішчы былі абкружаны валамі, равамі і крапаснымі сценамі. З канца 2 ст. да н.э. распаўсюджваюцца апідумы — протагарадскія паселішчы, якія з'яўляліся буйнымі племяннымі, рамеснымі і гандл. цэнтрамі.

Кельты жылі ў наземных дамах з каменнымі фундаментамі і плятнёва-каркаснай канструкцыяй сцен. Жытлы абмазвалі глінай, дахі крылі саломай. Вядомы таксама паўзям-



*Фібулы латэнскай культуры.*